***Таццяна Валодзіна***

# ДА ЭТНАЛІНГВІСТЫЧНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ПРЫКМЕТЫ «*ГАРБАТЫ*» Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ[1]

Прамое значэнне прыметніка *гарбаты* адносіцца да чалавека альбо жывёлы, што маюць анармальную пукатасць на спіне (радзей на грудзях). Прыказкі зафіксавалі сама відавочнае і прамое суаднясенне гарбатасці з цяжкой фізічнай працай: *Баба слязой, а мужык гарбом працуюць*; *Гарод любіць гарбатую бабу*. Нарастанне гарба бачыцца таксама як прыкмета старасці: *Старасць не радасць, і горб не карысць*. Зафіксаваная на Падзвінні рэкамендацыя не пускаць у панядзелак Масленічнага тыдня ў хату старых мужчын, каб не горбіліся сыры, і можа быць патлумачана на падставе суаднясення старога і гарбатага, што, акрамя іншага, сведчыць пра страту жыццёвай энергіі і пачатак пераходу з «гэтага» свету на «той » [9, 124].

З’яўленне гарба ў народных тлумачэннях найперш звязваецца з парушэннем цяжарнай жанчынай замацаваных у соцыуме правілаў, калі горб выразна супастаўляецца з падобнымі па форме прадметамі - «Нільзя, вот як сталбы два, дык бярэменнай пад імі нільзя прахадзіць, дзіця гарбатым будзіць»ь [1, зап. Валодзіна Т. і Лобач У. ад Паўлавай Ф.А., 1930 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на]. Небяспечна наступаць на аглоблю, дугу, хамут, пугаўё, абручы, абады, палазы і наогул крывыя прылады, неахайна кінутыя на двары: дзіця абавязкова будзе гарбатае [5, 4]. З гэтай жа мэтай куму не дазвалялі хадзіць па ваду для хрышчэння немаўляці з каромыслам [9, 124]. Устойлівае судачыненне гарба менавіта з каромыслам працягваецца і праз кадзіраванне гэтага начыння ў загадках: *Чуць свет ды зара нясуць гарбатага з двара; Гарбаты бес на дзеда узлез*.

Метафарычныя адценні прыметніка гарбаты адшукваюцца перадусім у фальклорных тэкстах, дзе гэты атрыбутыў уваходзіць у розныя кантэксты, прытым даволі далёкія ад фізіялогіі чалавека. Прыкмета становіцца ацэнкавай, набывае этнакультурныя функцыі, значна пашырае сваю рэферэнтную базу. Гарбатым пачынае называцца чалавек з роўнай спінаю і грудзямі. Найбольш выяўна горб служыць для пазначэння чалавечых недахопаў, прычым фізічная непрывабнасць зусім неабавязкова можа суадносіцца з наяўнасцю гарба: рус. дыял. *Сундук с бельём, да невеста с горбом* ‘пра непрыгожую, але багатую нявесту’. Досыць іншасказальна, але выразна на капрызлівую асобу паказвае беларуская прыказка *Чым больш кошку гладзіш, тым больш горб падымае.* І ўжо на ўзроўні абагульнення -- *Свайго гарба ніхто не бачыць.* Менавіта
ў плашчыні ўспрымання горбу як метафары духоўнай хібы, капрызаў і цяжкога нораву разумееца фразема *параўняць гарбы ‘*правучыць’ «Параўняў бы ёй гарбы, знала б, пачом сыры ў Мазыры » [3, 83].

Вытворны семантычны комплекс ‘хібнасць’ датычна да гарба рэалізуе два яго складнікі 1) крывізну і 2) пазбыткоўнасць. У культурна маркіраваных кантэкстах кожны з іх актуалізуе свой семантычны блок. Сінанімічнасць крывога і гарбатага зусім відавочная ў загадках «Гарбаты дзед усе поле збегаў»/«Крывенькі дзядок усё поле аббегаў». Гарбатасць праз сваю адзнаку крывізны, скручанасці поруч з іншымі фізічнымі недахопамі характарызуе сферу дэманічнага. У беларусаў гарбатым маляваўся вадзянік [4, 348], дамавік - «Сама бачыла дамавіка. Гэта быў маленькі, гарбаты старычок. Ён як бы сядзеў каля вакна» [2, зап. ад Татарынавай Л.І. у в. Стралкі Верхнядзвінскага р-на]. У шэрагу запісаў злыдні (нячысцікі, якія насылаюць на чалавека няшчасці) -- малыя гарбатыя, скурчаныя стварэнні. Забаранялі красці у суседзяў лыжкі, бо «завядуцца злыдні». Наагул з міфічнымі злыднямі ўстойліва карэлюе менавіта лыжка, яна нават рэчыўна ўвасабляе іх. Верагодна, і ў дадзеным выпадку актуальнай стала «гарбатасць» лыжкі.

Горб служыць неад’емным атрыбутам старэйшых чарцей. У беларускіх паданнях гаворыцца, што пераможаныя Божым ваярствам чэрці былі зрынутыя з нябёсаў і найбуйнейшыя з іх, як больш важкія, атрымалі сур’ёзныя пашкоджанні: паламалі ногі, панабівалі гарбы. Адзнака скручанасці абумовіла экспрэсіўнае найменне гарбуна *верчам* – «Ох, *верч чортоў*, гледзі, онь ек горб цебе скруціў!», першаснае значэнне гэтай лексемы – ‘скрутак лыка ці лазовай кары’ [8, 115].

Любое адступленне ад нормы, скажэнне яе – ці гэта кульгавасць, гарбатасць, слепата, немата, лысіна, ці незвычайныя прапорцыі і форма цела – усё выступае ў архаічным разуменні як вынік умяшання антысвету, як яго рэпліка. У каляндарнай абраднасці гарбунамі апранаюцца тыя ўдзельнікі абходаў, што рэпрэзентуць гасцей з «таго свету». Падчас шчадравання ў Магілёўскай губерні горб рабіўся Шчадрацу, а ў Добрушскім раёне пры «ваджэнні сулы» — «дзеду», «бабе» і «старцам». У канцы XIX ст. шляхта Гомельскага павету вадзіла на Каляды «кральку» — апранутую агіднай карліцай дзяўчыну з двума гарбамі. «Шчадровали пад Новы год, уберались хто як: цыганами, Бабой-Ягой, цапок у руки, горбы делали, мазали мукой чы сажэй» [7, зап. Вінаградава Л. у в. Грабаўка Гомельскага р-на] .Горб у працэсіі калядоўшчыкаў прыпісваўся чорту: «Как чорти були з рожкама, и шуба пэревёрнута. И подложено було, жупан неки. Горба робили. Били такую палкою по том горбу. Один чорт, той горбати» або яўрэю – «А иде и дзвонькае, яўрэй там есть, чорток з рожками, а жыдок такі горбаты, а по лбу як дасць» [7, зап. Плотнікава А. у в. Радчыцк Столінскага р-на]. «Іншы раз так хадзілі, не наражаліся. Папаюць з гэтаю звяздою і ўсё. Усё з бумагі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

---

[1] Работа падрыхтавана ў межах выканання праекта БРФФД № Г11ОБ-023/2 «Антрапацэнтрызм і анімізм як аснова мадэлявання свету ў традыцыйнай культуры беларусаў» ад 15.04.2011 г.

прыдумлялі «казу». То ўжэ смех, як забляе «каза». А чалавек бляе ў гэтай масцы, кажух у яе вывернуты, і горб там які здзелаюць. Эта на багату каляду хадзілі» [1, зап. Т. Кухаронак ад Прохар В., 1912 г.н., в. Улезлы Ваўкавыскага р-на].

У шэрагу кантэстаў прама пазначаецца наяўнасць гарба ў чараўніка – «Што, дзед Одам, вы на мне ўжэ іспіталі свое знахорство, свое колдовство. Вы на мне, еслі бы я оставіла пяць дзецей, (а вон быў дзед горбаты, а я со зла говору), а вы горба наставілі, (просты мне, Господзі) да годовалі б мої дзеці!?! Бо вы мне зробілі, што я чуць нэ умерла там!» [1, зап. А. Боганева ад Мышапуд Р.І., 1940 г.н., в. Рэчыца Столінскага р-на]. У іншых запісах апавядаецца пра цяжка хворую жанчыну, да якой «на Пасху прыхадзіў нейкі храмы ці гарбаты, вот ён наверна здзелаў» [1, зап. у 2002 г. Валодзіна Т. у г.п.Вула Бешанкавіцкага р-на ад Баранавай І.П., 1914 г.н.]

У кантэксце этнамедыцынскіх уяўленняў горб суправаджаў хваробы, міфалагічны анамнез якіх непасрэдна судносіцца са сферай дэманічнага, – каўтун і падучую: «Мая мама была дзеўкаю, павяла каня на начлег. Ну і што. Коні ходзяць, а яны палеглі спаць. І з суседняе дзярэўні, мая мама ляжала, а хлопцы злавілі жабу, і яны жабу ўкінулі за карак. Халодна, а другое, што драпаецца. Яна так спужалася, што ў яе паявіўся каўтун -- дык мая мама згорбілася, горб нарос. Яна ўжо была сагнута» [1, зап. Валодзіна Т. ад Бачко А.П., 1924 г.н., у в. Падлессе Слуцкага р-на], «Мой жа малодшы брат быў, як маленькі, прыпадачны і гарбаты. Мама вазіла яго кудысь у Беларусь да знахара і вылячыла яго ад гарба і ад прыпадку» [2, зап. ад Спірыдонавай Н.І., 1930 г.н., в. Ляхава Себежскага р-на].

Сема пазбыткоўнасці адпачаткова прадвызначае суаднясенне гарба з багаццем, якое да таго ж памнажаецца на папулярную ў фальклорных тэкстах рыфму: «гарбаты – багаты». Нават у народным сонніку «Гарбатым ува сне быць — прыбытак; яго стыдзіцца - не зусім добрай дарогай гэты прыбытак атрымаеш». У прыказках – *Хоч за горбатого, абы за богатого.* Як прыбытак лагічна разумець і цяжарнасць, тым больш што жывот цяжарнай жанчыны знешне раўнуецца да гарба. Такое суаднясенне выразнае ў вясельных пажаданнях беларусаў *Богацейце да сперэду горбацейце* [8, 218]. Пры тым па-за рытуальным кантэкстам з'яўленне гарба не на спіне, а на жываце, як бы па-за нормай, вызначае зніжаную экспрэсіўнасць і негатыўную канатацыю выразаў з адпаведным кампанентам. Так, фразема, *спераду горб расцець* апісвае цяжарнасць, але адмоўна маркіраваную, г.зн. пазашлюбную.

У купальскай песеннасці нечакана з'яўляецца вобраз трох/чатырох купалкіных дачок, калі гарбатая невысокая дзяўчына выгодна проціпастаўляецца «тонкай, высокай» і «белай, румянай», бо «мала, гарбата сыноў народзіць, сыноў народзіць, войска расплодзіць», у іншай песні «тоўста, гарбата жывець багата» [6, 467; 469]. Досыць асобна знаходзіцца вобраз казачнага Канька-Гарбунка, нехлямяжай з выгляду жывёліны, з гарбом (двума), якая, аднак, надзелена незвычайнымі здольнасцямі мудрага дарадцы і памочніка. Натуральна, дае такія моцы той свет, які ў міфалагічнай свядомасці выступае як усеабдымная крыніца ведаў і дастатку. Магчымы ў дадзеным выпадку і паралелі з гарбунамі-гномамі і эльфамі еўрапейскіх легендаў, што ў полі сваіх семантычных адценняў месцяць паказанні на звышведы, апякунчыя магчымасці і г.д.

Такім чынам, і Канёк-гарбунок, і пераапранутыя калядоўшчыкі, і вясковыя чарадзеі, праз адзнаку свайго калецтва выяўляюць адносіны да тагасветнай прасторы, што і прадвызначае іх звышнатуральныя здольнасці. Іншая справа, рэалізацыя гэтых здольнасцяў вызначаецца агульнай семантыкай вобразаў, сітуацый, кантэкстаў, жанравай прыродай адпаведных тэкстаў.

І нарэшце, як *гарбыль, гарбок* пазначаюцца няроўнасці, узгоркі на зямной паверхні, што заканамерна ў рэчышчы ўніверсальнай міфалагічнай асаблівасці, якой выступае ізамарфізм чалавека і прыроды. Ужо на самых ранніх ступенях развіцця чалавек усведамляў сваю непарыўную сувязь з прыродай і сваё «прыроднае» паходжанне. Пры гэтым ізаморфны характар іх узаемаадносін не абмяжоўваецца рамкамі антрапамарфізму. Чалавек не толькі творыць «суб'ектыўную» рэальнасць па сваім вобразе і падабенстве, але і сам аказваецца ўцягнутым у працэс ідэнтыфікацый. Можна сцвярджаць, што ў міфалагічным светапоглядзе чалавек і прырода адлюстроўваюцца адзін у адным.

**Спіс літаратуры:**


1. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАНБ.
2. Архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.
3. Жывое слова / рэд. Ю.Ф. Мацкевіч, І.Я. Яшкін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 134 с.
4. Зямная дарога ў вырай. Беларускія народныя прыкметы і павер'і. – Кн. 3. / уклад. У. Васілевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1999. – 146 с.
5. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обычаи и обряды, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск, 1897.
6. Купальскія і пятроўскія песні / уклад. А.С. Ліс і С.Г. Асташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 132 с.
7. Палескі архіў Інстытута славяназнаўства РАН.
8. Тураўскі слоўнік / уклад А. Крывіцкі, Г. Цыхун, І. Яшкін. – Мінск., 1982. – Т. 1.
9. Філіпенка, У. Горб / У. Філіпенка // Міфалогія беларусаў : Энцыклапедычны слоўнік. – Мінск : БелЭн, 2011. – С. 87.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ